# СЯМЕЙНАЕ ВЫХАВАННЕ: З ГІСТОРЫІ І СУЧАСНАСЦІ

## Навукова-папулярны агляд

*В. У. ЧЭЧАТ,*
***загадчык лабараторыі сямейнага выхавання Нацыянальнага інстытута адукацыі, кандыдат педагагічных навук***

### Кароткі экскурс у мінулае

Калі мы вядзём гаворку аб сям'і і яе ролі у выхаванні падрастаючай змены, дык не трэба забываць і адкідваць усе тыя крупінкі станоучага, што назапашаны непасрэдна сям'ёй, сумеснымі намаганнямі сям'і і школы, а таксама сям'і і грамадскасці.

Сям'я і бацькоускі дом у нас на Беларусі на пачатку XX ст. (20—30-я, а затым 40—50-я гг.), у якім сумесна пражывала некалькі пакаленняу (бабуля і дзядуля, бацька і маці, некалькі дзяцей розных узростау, старэйшыя з якіх былі ужо нават жанатыя ці замужнія), станавіліся жыццёва важным прытулкам і апорай для усіх членау сям'і, першай і самай дзейснай школай маральнага і працоунага выхавання, падрыхтоукі дзяцей да самастойнага, у першую чаргу сямейнага, жыцця. Вясковыя дзеці з 8—10 гадоу сумесна з бацькамі сістэматычна на працягу усяго каляндарнага года, асабліва у летнія месяцы, працавалі на прысядзібных участках, у садзе і агародзе, выконвалі пасільную і даволі працаёмкую работу на палях і фермах. Дзучынкі-падлеткі ужо у 10—12 гадоу валодалі неабходным практычным вопытам працоунага сямейнага жыцця: умелі спавіваць, купаць, карміць малых, з дзецьмі 5—7 гадоу наладжвалі гульні, навучалі іх песням і танцам, разам з бацькамі рыхтаваліся да народных святау. Дзеці з гарадоу у летні перыяд прыязджалі да сваіх родзічау, блізкіх і знаёмых у сельскія сем'і (працэнт сельскага насельніцтва складау у 1940 г. каля 80, у 1950 г. звыш 75, у 1970 г. каля 60). Тут разам з вясковымі дзецьмі у рознаузроставых групах яны навучаліся карысным працоуным навыкам і уменням, вядзенню хатняй гаспадаркі, догляду свойскай жывёлы, збіралі ягады і грыбы, лекавыя расліны, засвойвалі практычную этыку сямейных адносін і сямейнага жыцця. Бацькі, старэйшыя члены сям'і асабістым станоучым прыкладам выхоувалі малодшых. Дзеці пад кіраунiцтвам і з дапамогай старэйшых атрымлівалі жыццёвыя, працоуныя і сямейныя навыкі.

У такіх вялікіх сем'ях (нават калі дзеці і аддзяляліся) дзейнічала залатое агульнароднаснае (яно ж і агульначалавечае) правіла: бацькі дапамагалі нашчадкам цвёрда стаць на ногі, дзеці у сваю чаргу у знак удзячнасці і па правілах народнай этыкі забяспечвалі бацькам спакойную старасць, з павагай адносіліся да іх. Гэта былі тыя часіны, калі нашчадкі з малаком маці засвойвалі ад старэйшых святыя традыцыі сям'і і сямейнага жыцця беларусау: «Нельга зняславіць гонар свайго дома», «Тут і я, тут і жонка мая, тут і дзеці, люба паглядзеці», «Уся сямейка збіраецца — сэрца радуецца», «Без дзяцей ціха, ды на старасці ліха», «Многа дзяцей — многа клопату, але і радасці шмат»,

«Радзі мне дзевяць сыноу,
А дзесятую дочку...
Сыны будуць поле баранаваць,
А дачка хустачкі ткаць».

У вялікіх сем'ях таго часу свята берaглі многавяковую народную мудрасць, якая вучыць: дзе у сям'і добрыя узаемаадносіны, там і дзеці правільна растуць і выхоуваюцца («Дзе у сям'і лад, там і дзеці добра гадуюцца», «Муж жонку знойдзе, жонка мужа знойдзе, а дзеці бацькоу не знойдуць»).

Вялікія сем'і выхоувалі усіх членау гуманнымі, чулымі, сардэчнымі людзьмі, якія заусёды адклікаліся на гора іншых людзей. Менавіта таму у ваенныя і цяжкія пасляваенныя гады у Беларусі амаль не было дзяцей-сірот, што знаходзіліся па-за увагай людзей. Маці, якая рабіла спробу пасіраціць дзяцей, чакала усеагульнае чалавечае асуджэнне і ганьбаванне як з боку родзічау, так і суседзяу, усіх вяскоуцау. А дзяцей-сірот, якіх такімі зрабіла вайна, рэдка адпраулялі у спецыяльныя дзяржауныя выхавауча установы. Часцей за усё сірот бралі у свае сем'і родзічы ці суседзі. У народнай педагогіцы замацаваліся такія маральныя агульначалавечыя правілы у адносінах да абяздоленых дзяцей,

як «Усё сяло глядзіць сірацінку», «Не пасці, не маліся, а дай прытулак сіраце», «За прытулак сіраты бог шчасце падае», «Чужое дзіця прыносіць шчасце у дом».

На станоучае маральнае развіццё і выхаванне дзяцей у вялікіх сем'ях уздзейнічала тое, што зносіны у іх былі пабудаваны на аснове багатых роднасных адносін. Гэта значыць, што у сістэме такіх адносін эфектыуна спрацоувалі на выхаванне нашчадкау такія маральныя каштоунасці, як сямейная, бацькоуская, сыноуская (даччына) любоу, інтымна-эмацыянальныя фактары, узаемнае разуменне, сардэчнасць, спагадлівасць, шчырасць, давер'е, цеплыня, чуласць, праяуленне клопатау аб усіх членах сям'і, асабліва аб малых і старых. Для дзяцей унутрысямейныя сувязі і адносіны з'яуляюцца той кладачкай, праз якую у іх нараджаюцца і выхоуваюцца пачуцці сувязі з грамадствам, народам, Бацькаушчынай, увогуле з усім чалавецтвам. Інакш кажучы, агульначалавечае толькі у тым выпадку становіцца рэальнасцю для дзяцей, калі яно абавязвае іх у адносінах да самага роднага і блізкага чалавека. Як трапна заначыу пра гэта вядомы украінскі педагог В. А. Сухамлінскі, мільёны сем'яу — гэта мільёны найтанчэйшых карэньчыкау, што жывяць вечнае дрэва, імя якому — Айчына. Радзіма для дзіцяці пачынаецца з сям'і, з бабулі і дзядулі, з маці і бацькі, з братоу і сёстрау, з іх адносін, расказау, успамінау, песень. Калыханка маці і бабулі — гэта для нашчадкау акенца, праз якое яны успрымаюць прыроду, навакольны свет, родных, блізкіх, усіх людзей.

Нельга сказаць, што у традыцыйных вялікіх сем'ях было усё ідэальна. Здараліся і спрэчкі, сваркі, часовыя непаразуменні. Але у цэлым у такіх памерах разводау, дэфармацый сям'і, адмаулення ад родных дзяцей, што пачаліся у 60-х — пачатку 70-х гг., у ранейшых беларускіх сем'ях не назіралася. Не значылася таксама і такой вялікай колькасці так званых цяжкіх дзяцей і падлеткау.

### Яшчэ адзін экскурс у гісторыю (здабыткі станоучага вопыту)

І усё ж у складаныя 60-я — пачатку 80-х гг. большасць беларускіх сем'яу імкнуліся да таго, каб вырасціць сваіх дзяцей адукаванымі і выхаванымі грамадзянамі, руплівымі працаунікамі, патрыётамі-інтэрнацыяналістамі, сумленнымі і прыстойнымі людзьмі, добрымі сямейнікамі. Бацькі разам з выхавацелямі і педагогамі шукалі дзейсныя шляхі, формы і сродкі выхавання нашчадкау, паглыбляліся у методыку сямейнага выхавання. Гэтаму садзейнічалі і такія фактары, як павышэнне адукацыйнага і культурнага узроуню бацькоу, прыход у кожную сям'ю тэлебачання, кніг, газет, часопісау, функцыяніраванне ва установах адукацыі і на прадпрыемствах педагагічнага усенавуча у самых розных формах.

У выхаванні дзяцей **дашкольнага узросту** выхавацелі разам з бацькамі дабіваліся адзінства у арганізацыі рэжыму жыццядзейнасці дашкольнікау, у адпрацоуцы зместу і методыкі гульнявай і працоунай дзейнасці, у навучанні выхаванцау і падрыхтоуцы іх да школы з шасці гадоу. У садружнасці з настаунікамі і вучонымі (педагогамі, псіхолагамі, медыкамі) бацькі былі далучаны да навучання, развіцця і выхавання шасцігодак у СШ № 7 і 130 г. Мінска. У Клецкім раёне Мінскай вобласці і Савецкім раёне г. Мінска, дзе тры з паловай тысячы дзяцей шасцігадовага узросту навучаліся пяць дзён у тыдзень па эксперыментальнай праграме, якой прадугледжвалася укараненне новых элементау рэжыму у практыку сямейнага выхавання (арганізацыя аздараулення і паунацэннага развіцця дзяцей у суботу і другую палову дня, калі заняткі заканчваліся у першую змену), таксама удзельнічалі бацькі.

У выхаванні дзяцей **падлеткавага узросту** бацькі у саюзе з педагогамі знаходзілі сродкі маральнага і працоунага уздзеяння на сыноу і дочак, фарміравання іх эстэтычных густау, выхавання павагі да старэйшых, беражлівых адносін да прыроды і грамадскіх каштоунасцей. У беларускіх сем'ях асаблівая увага удзялялася выхаванню у падлеткау добрасумленнасці і працавітасці. Яны разам з бацькамі выконвалі пасільную працу у перыяд летніх канікул, за свае старанні атрымлівалі матэрыяльнае і маральнае заахвочванне.

Бацькі разам з сынамі і дочкамі прымалі удзел у экалагічнай (прыродаахоунай) дзейнасці. Пры гэтым, калі школа давала хлопчыкам і дзяучынкам пераважна тэарэтычныя веды, дык сям'я — практычныя уменні і навыкі. Тэарэтычныя веды аб прыродзе і яе ахове вучні IV—VI класау шасці школ (СШ № 5, 18, 30 г. Магілёва, Гадылёускай, Вейнянскай і Верамейскай Магілёускай вобласці) атрымлівалі ад настаунікау у такіх аб'ёмах: «у IV класе — 76,9 %, у VI класе — 50,0 %; ад бацькоу у IV класе — 15,3 %, у VI класе — 23,6 %. Практычныя уменні і навыкі па ахове і акультурванню прыроды выпрацоу-

валіся настаунікамі у аб'ёмах: у IV класе — 19,2 %, у VI класе — 31,8 %; бацькамі у IV класе — 34,6 %, у VI класе — 47,4 %» (Глякава М. Д. Экалагічнае выхаванне дзяцей у сям'і // Псіхолага-педагагічныя праблемы сямейнага выхавання: У 4 ч. / Адказны рэдактар Я. І. Сярмяжка. Магілёу, 1985. Ч. І. С. 153).

У выхаванні дзяцей **юнацкага узросту** бацькі прыкладалі намаганні на вырашэнне праблем выбару юнакамі і дзяучатамі будучай прафесіі, уключэння іх у грамадска карысную, вытворчую працу, падрыхтоукі да службы у арміі, да сямейнага жыцця. Рэальнае жыцце сведчыла, з аднаго боку, аб тым, што некаторая частка дзяучат, якія толькі што скончылі школу, уступала у шлюб. З другога боку, гэтыя дзяучаты і пераважная большасць іншых, што рыхтаваліся выконваць функцыі жонак і маці, зусім не былі падрыхтаваны да гэтага. Таму лагічна і заканамерна і паустала пытанне аб неабходнасці увядзення мэтанакіраванай спецыяльнай падрыхтоукі вучнёускай моладзі да сямейнага жыцця. З 1981/82 навучальнага года у IX—X класах асобных школ рэспублікі пачалася апрабацыя курса «Этыка і псіхалогія сямейнага жыцця». З 1984/85 навучальнага года гэты курс як абавязковы быу уведзены ва усіх нашых школах. Школа і сям'я сталі больш нрадметна рыхтаваць юнакоу і дзяучат да сямейнага жыцця. У практыку увайшлі наступныя формы сумеснай работы бацькоу і педагогау:

выступленні перад вучнямі сямейных пар, якія святкавалі «сярэбраныя» і «залатыя» юбілеі сумеснага жыцця;

сустрэчы юнакоу і дзяучат з маладымі сем'ямі, якія стварылі былыя вучні школы;

правядзенне канферэнцый і «круглых сталоу» бацькоу і вучняу па тэмах «Сямейныя традыцыі», «Сучаснае вяселле», «Свабода у каханні і тэорыя свабоднага кахання»;

выстаукі «Сямейныя захапленні»;

сустрэчы юнакоу і дзяучат з работнікамі ЗАГСау, юрыстамі, урачамі, псіхолагамі і інш.

Бацькам для эфектыунага выхавання дзяцей рознага узросту патрэбна была псіхолага-педагагічная адукацыя. У рэспубліцы на базе дзіцячых садоу, школ, прадпрыемствау працавалі лекторыі і народныя універсітэты педагагічных ведау. Заняткі у іх вяліся па планах-праграмах, якія распрацоуваліся у кожнай вобласці. З 1982 г. большасць лекторыяу і універсітэтау працавала па «Прыкладнай праграме заняткау у народных універсітэтах педагагічных ведау для бацькоу» (1-е выданне выйшла у 1982 г., 2-е — у 1984 г., 3-е — у 1986 г.). Праграма была разлічана на бацькоу, якія мелі дзяцей старэйшага дашкольнага і школьнага узросту. У змест заняткау уключаліся важнейшыя праблемы навучання і выхавання дзяцей, падлеткау, юнакоу і дзяучат. Разглядаліся прававыя, медыцынскія, маральна-этычныя, прафарыентацыйныя пытанні. На занятках перад бацькамі выступалі педагогі, псіхолагі, урачы, юрысты, дзеячы культуры і інш. У лепшых лекторыях і універсітэтах часта выкарыстоуваліся актыуныя формы навучання: абмен вопытам па праблемах сямейнага выхавання; гутаркі; індывідуальныя і групавыя кансультацыі для бацькоу, іншых членау сям'і, а таксама асоб, якія замянялі бацькоу; аналіз сямейных сітуацый; вечары пытанняу і адказау; агульныя бацькоускія канферэнцыі па важнейшых пытаннях выхавання дзяцей у сям'і; мэтавыя канферэнцыі (асобна для бабуль, дзядуль, бацькоу, маці); праслухоуванне магнітафонных запісау радыёперадачы «Дарослым — аб дзецях»; агляды навінак псіхолага-педагагічнай літаратуры па праблемах выхавання дзяцей у сям'і і інш.

З мэтай навукова-метадычнага забеспячэння псіхолага-педагагічнай адукацыі бацькоу сіламі вучоных (педагогау, псіхолагау, сацыёлагау), работнікау Міністэрства асветы і выдавецтва «Народная асвета» у рэспубліцы выдаваліся і перавыдаваліся кнігі па праблемах сямейнага выхавання вядомых айчынных і замежных педагогау (Я. Корчака, А. С. Макаранкі, Б. Спока, В. А. Сухамлінскага і інш.). У 70-я — пачатку 80-х гг. выходзілі навукова-метадычныя і навукова-папулярныя дапаможнікі, а таксама кнігі і брашуры, якія абагульнялі станоучы вопыт выхавання дзяцей у сям'і. 29 дапаможнікау і іншых кніг выйшлі вялікімі тыражамі у папулярнай серыі «Бацькам аб дзецях» (з 1969 па 1983 г.). Каля трыццаці дапаможнікау атрымалі бацькі у серыі «Сямейная педагогіка», выпушчаных выдавецтвам «Народная асвета» (з 1983 па 1994 г.). Яны прысвечаны праблемам псіхалогіі сямейнага выхавання, культуры зносін бацькоу і дзяцей, метадам навучання дзяцей у сям'і, выхавання іх характару, волі, пачуццяу, ведання індывідуальных і узроставых псіхалагічных асаблівасцей. Многія з іх раскрываюць пытанні працоунага, маральнага, патрыятычнага, палавога і эстэтычнага выхавання дзяцей, падлеткау, юнакоу

і дзяучат у сям'і. Акрамя таго, для слухачоу народных універсітэтаў былі падрыхтаваны дапаможнік «Сямейна-бытавая культура», матэрыялы у дапамогу настаунiку па праблемах сямейнага выхавання.

Для каардынацыі дзейнасці педагогау, бацькоу і прадстаунікоу грамадскасці у штаты сярэдніх школ была уведзена пасада арганізатара пазакласнай і пазашкольнай выхаваучай работы (1967 г.). Яны працавалі у цеснай садружнасці з бацькоускімі камітэтамі, саветамі грамадскасці, саветамі садзейнічання сям'і і школе, ЖЭКамі і ЖЭСамі, жаночымі саветамі, камісіямі па справах непаунапетніх.

Са з'яуленнем у школах арганізатарау пазакласнай і пазашкольнай выхаваучай работы значна палепшылася працоуная, фізкультурна-спартыуная, турысцкая, мастацка-творчая дзейнасць дзяцей, падлеткау і юнакоу. Асабліва плённа працавалі арганізатары СШ № 6, 10, 16, 74, 86, 88 г. Мінска, СШ № 1, 6, 10 г. Слуцка. Напрыклад, у СШ № 6 г. Мінска вялася мэтанакіраваная дзейнасць па падрыхтоуцы старшакласнікау да работы у лагеры працы і адпачынку «Юнацтва», які быу створаны летам 1971 г. у калгасе «1 Мая» Мядзельскага раёна Мінскай вобласці. Тут разам з педагогамі і бацькамі кожнае лета працавалі беларускія і эстонскія школьнікі. У выхадныя дні яны хадзілі у паходы па маляунічых і багатых гераічнымі традыцыямі нарачанскіх мясцінах. У старэйшай школе Беларусі № 1 г. Слуцка у 60-я гг. былі створаны і функцыяніравалі сімфанічны аркестр, хоры вучняу малодшых і старэйшых класау, ансамбль баяністау, эстрадны аркестр, некалькі актэтау юнакоу і дзяучат.

### Недахопы і супярэчнасці у сямейным выхаванні

Пры усім станоучым паступовa усё больш і больш пачалі адчувацца цяжкасці, значныя недахопы і супярэчнасці у сямейным выхаванні. Яны былі вынікам, з аднаго боку, няправільных адносін дзяржавы да сям'і і сямейнага выхавання, з другога, прафесіянальнай (псіхолага-педагагічнай і метадычнай) непадрыхтаванасці выхавацеляу, педагогау і бацькоу да ажыццяулення эфектыунага працэсу фарміравання дзяцей розных узростау ва умовах сям'і.

У Беларусі, як і у цэлым у былым СССР, важнасць і значнасць сям'і, сямейнага укладу жыцця для паунацэннага развіцця дзяцей, перадачы ім матэрыяльнага і духоунага вопыту не толькі недаацэньваліся, але і пастаянна ігнараваліся. Ужо у 20-я гг. быу абвешчаны прыярытэт грамадскага над асабістым. У 40—60-я гг., калі сем'і у большасці сваёй працягвалі яшчэ нядрэнна функцыяніраваць, пачалі з'яуляцца «вучоныя» і дзяржауныя «дзеячы», якія сцвярджалі, што сям'я становіцца перашкодай для жанчыны, яе вытворчай працы і грамадскай дзейнасці, для яе усебаковага развіцця. Дзеячы партыі і урада, замест таго каб распрацаваць доугатэрміновую дзяржауную праграму сям'і, аказаць ёй матэрыяльную і сацыяльна-прававую падтрымку, узмацніць яе адказнасць за выхаванне дзяцей, давалі у аснове сваёй памылковыя установкі і лозунгі накштaлт «Жанчыны! Актыуна уключайцеся у грамадскую працу!», «Наша мэта — поуная эмансіпацыя жанчыны», «Свабоду жанчыне ва усіх сферах жыцця!» і да т. п. І многія жанчыны паверылі у «поуную свабоду»: працавалі нарауне з мужчынамі, былі заузятымі актывісткамі у грамадскім жыцці, не ведалі выхадных, а дзеці у гэты час блукалі па мікрараёнах у чаканні маці-актывістак. Для тых жа дзяцей, да якіх «эмансіпіраваныя» маці даволі часта перасталі вяртацца, дзяржава стварала «адпаведныя умовы», каб менш займацца сям'ёй і выхаваннем дзяцей (школы-інтэрнаты, дзіцячыя дамы, дамы дзіцяці і г. д.).

Недаравальная няувага да сям'і, недаацэнка яе як самай неабходнай першаснай ячэйкі грамадства, як унікальнага і нічым незаменнага інстытута выхавання дзяцей, памножаная на сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і маральна-псіхалагічныя дэфармацыі, у рэшце рэшт далі і адпаведныя негатыуныя вынікі. Сярод іх асабліва сталі кідацца у вочы наступныя.

1. Павелічэнне колькасці разводау. У пачатку 80-х гг. па былому Саюзу ССР, дзе пражывалі 80 млн. сямей, штогод заключалася 3 млн. шлюбау, а распадалася іх амаль 1 млн. У Беларусі наглядалася прыкладна аналагічная карціна: штогод на 3 рэгістрацыі шлюбау прыпадау 1 развод (прычым, у гарадах на тысячу жыхароу каля пяці разводау, у сельскай мясцовасці — 1,5). Часцей за усё разводзіліся муж і жонка ва узросце 20—29 гадоу, на першыя дзесяць гадоу сямейнага жыцця прыпадала каля 65 % разводау, ініцыятарамі якіх у пераважнай большасці былі жанчыны.

2. Павелічэнне колькасці дзяцей-сірот (у большасці пры жывых бацьках). У былым Саюзе ССР у 80-я гг. іх налічвалася больш за 1 млн. (у Бе-

ларусі — 18 тыс.). Сіроцтва — гэта яскравы вынік маральнай нядольнасці, а дакладней, маральнага разлажэння (дэградацыі) вялікай часткі членау нашага грамадства, што праяулялася і праяуляецца сёння (можа, крыху у меншых памерах, бо некаторыя людзі апамяталіся) у п'янстве; разводах; аслабленні роднасных сувязей; анамальным спосабе жыцця маці-адзіночак; рафініраваным эгаізме вялікай катэгорыі жанчын; нястрымным матэрыяльным спажывальніцтве; адсутнасці духоунай, псіхалагічнай і педагагічнай культуры большасці людзей.

3. З'яуленне у асяроддзі жанчын ультрановых «традыцый» і «звычак», антычалавечага і антыжаночага спосабу жыцця, што прывяло да павелічэння

катэгорыі грубых і жорсткіх феміністак, якія згубілі спецыфічна-традыцыйныя жаночыя рысы і якасці не толькі у знешнім аблічччы, але і ва унутранай эмацыянальна-патрэбнаснай сферы;

катэгорыі жанчын, якія не толькі не жадаюць нараджаць дзяцей, але наогул і выходзіць замуж (ёсць такая «традыцыя» і сярод мужчын, але у значна меншай меры);

катэгорыі жанчын, якія, акрамя уменняу «майстраваць» сваё знешняе абліччча, нічога не умеюць рабіць (рацыянальна весці хатнюю гаспадарку, шыць, вязаць, рыхтаваць стравы, іграць на музычных інструментах, навучаць, развіваць і выхоувааць дзяцей). Амерыканскі вучоны Джон Апдайк пра такіх духоуна убогіх і няумелых жанчын зауважыу: калі у пачатку шлюбнага жыцця няма захаплення інтэлектам жонкі, яе уменнямі, нават кулінарнымі здольнасцямі, дык няма упэуненасці, што муж і жонка змогуць пражыць доугае і шчаслівае жыццё (дарэчы, у дарэвалюцыйны час у Расіі гімназістак мэтанакіравана вучылі з густам апранацца, рабіць прыгожую прычоску, адпаведна паводзіць сябе у розных сітуацыях, давалі ім уменні шыць, іграць на музычных інструментах);

катэгорыі дзяучат (школьніц і студэнтак) з іх захапленнем сексам, які сродкамі масавай інфармацыі даведзены да альфы і амегі жыцця многіх з прыгожага полу;

катэгорыі сучасных какотак, якія дзейнічаюць у адзіночку і нават «фірмамі».

Усе гэтыя ультрановыя «традыцыі» і «звычкі» жанчын не маглі не накласці адбітак на іх свядомасць, пачуццёвую сферу і паводзіны, не прывесці да самых нечаканых адмоуных метамарфоз і дэфармацый у сям'і, сямейных адносінах, выхаванні дзяцей, у цэлым не адбіцца на культуры (бо, як заувжыу вядомы філосаф В. Розанау, «якая жанчына, такая ёсць ці вельмі хутка стане уся культура»).

У сувязі з супярэчлівасцю станаулення беларускай сям'і (па прычынах дэмаграфічнай сітуацыі, якая звязана з Вялікай Айчыннай вайной, урбанізацыяй, міграцыяй сельскіх сем'яу у гарады, змяншэннем дзетараджэння, павелічэннем ліку разводау, чарнобыльскай катастрофай і іншымі фактарамі) узнік шэраг складаных сацыяльна-педагагічных праблем, што звязаны з выхаваннем дзяцей у сям'і. Сярод іх:

змяненне выхавауучых функцый бацькі і маці;

асаблівасці выхавання дзяцей у няпоунай сям'і;

спецыфіка выхавання у сям'і адзінага дзіцяці;

супярэчлівасць уздзеяння на дзяцей высокай матэрыяльнай забяспечанасці асобнай катэгорыі сем'яу;

позняе працоунае сталенне дзяцей і уключэнне іх у вытворчую працу грамадства;

выхаванне дзяцей-сірот у прыёмных сем'ях, дзіцячых дамах сямейнага тыпу, у сем'ях, якія пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы і інш.

Асаблівыя цяжкасці і складанасці выхавання дзяцей звязаны з тым, што у гэтыя гады усё больш павялічвалася колькасць няпоуных сем'яу (у нашай рэспубліцы ужо да сярэдзіны 80-х гг. было каля 15 % такіх сем'яу ад агульнага іх ліку).

Супярэчнасці і складанасці у выхаванні дзяцей ішлі і ад таго, што больш за 65 % беларускіх сем'яу так ці інакш з'яуляліся неспрыяльнымі, г. зн. стыль адносін і зносін у іх паміж бацькамі, сама маральна-псіхалагічная атмасфера не садзейнічалі паунацэннаму выхаванню дзяцей.

(Заканчэнне будзе)